
Уладзімір ШЫМЧОНАК.


Віктар ЛЬВОЎ.


Іван ФІЛЮТЧЫК.


Мікалай АХРАМЕЙКА.


Леанід ЛЯЛЬКІН.

ПРАЕКТ «ЛЮБАНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ»

# І загрымелі ўзрывы на чыгунцы...

**У ноч на 3 жніўня 1943 года амаль адначасова раздаліся ўзрывы на многіх участках чыгуначных камунікацый у тыле нямецкіх войскаў. Гітлераўцы, як ні рыхтаваліся да адбіцця партызанскіх дыверсій, былі проста ашаломлены маштабамі разбурэнняў.**

Ашаломлены настолькі, што ў некаторых месцах узяліся за рамонт чыгуначнага палатна толькі на трэція суткі! Так пачалася славутая «Рэйкавая вайна» – аперацыя народных мсціўцаў з мэтай паралізаваць перакідку рэзерваў і падвоз боепрыпасаў адступаючым пасля паражэння ў Курскай бітве варожым групоўкам.

**Мала хто ведае, што своеасаблівай генеральнай рэпетыцыяй «Рэйкавай вайны» стала аперацыя «Граніт», план якой быў зацверджаны 21 красавіка 1943 г. загадам начальніка Беларускага штаба партызанскага руху П.З. Калінінам.**

Пад «Граніт» у тыл праціўніка – для партызанаў – самалётамі і планёрамі была дастаўлена значная колькасць зброі, боепрыпасаў, узрыўчаткі, капсуляў-дэтанатараў, бікфордавага шнура. Туды ж – у партызанскія зоны – закінулі не адзін дзясятак спецыялістаў-падрыўнікоў, якія вучылі народных мсціўцаў дыверсійнай справе.

Ужо 26 красавіка, праз пяць дзён пасля зацвярджэння плана, партызанская брыгада №64 імя В. Чкалава пад камандаваннем М. Розава ўзарвала мост даўжынёй 67 метраў праз Арэсу ля станцыі Вярхуціна на чыгуначнай лініі Асіповічы–Слуцк. Калі штурмавая група мост захапіла, яго адразу ж замініравалі падрыўнікі на чале з інструктарам Мінскага партызанскага злучэння па падрыўной справе **Уладзімірам Шымчонкам**. Праз некалькі хвілін мост узляцеў на паветра. У выніку рух цягнікоў па лініі перапыніўся на два тыдні.

Увогуле ж «Граніт» быў прызнаны не надта ўдалай аперацыяй (яна праводзілася да 1 чэрвеня 1943 г.). У тым ліку – і ў плане арганізацыі забеспячэння народных мсціўцаў усім неабходным для масавых дыверсій на чыгуначных камунікацыях праціўніка. Але дала вельмі каштоўны вопыт, які пасля дазволіў належным чынам падрыхтавацца да «Рэйкавай вайны».

Па-першае, партызаны надзвычай дакладна разведалі абстаноўку на чыгуначных камунікацыях праціўніка. А разведчыкі ў атрадах народных мсціўцаў былі адмысловыя. Напрыклад, Апанас Беразоўскі з Ямінска, які здабываў разведдадзеныя для атрада імя Я. Гарбачова, Аляксандр Рудзько з Калінаўкі – для атрада імя М. Сільніцкага, Мікалай Паторскі і Павел Дзяшковіч з той жа Калінаўкі ды Сямён Лагун і Мікалай Сініцкі з Малых Гарадзяцічаў – для штаба брыгады №25 імя П. Панамарэнкі, Валодзя Шпакоўскі з Татаркі (юнаку было ўсяго пятнаццаць гадоў, калі ён стаў партызанам) і Міхаіл Вечар з Ямінска – для атрада імя М. Громава, Яўген Гуткоўскі з Жывуні – для атрада імя А. Неўскага, і многія іншыя мужныя змагары з ворагам.

Яны абследавалі чыгунку ўздоўж і ўпоперак, выявілі сістэму і парадак аховы пэўных участкаў, дзе можна сустрэць патрульную дрызіну, а дзе – пешы патруль, месцы, дзе ёсць магчымасць скрытна падабрацца да чыгуначнага палатна, зафіксавалі размяшчэнне варожых умацаванняў на станцыях, склад і ўзбраенне іх гарнізонаў. Усё гэта стала надзейным падмуркам для паспяховага правядзення «Рэйкавай вайны».

Па-другое, партызаны скамплектавалі мноства груп мінёраў-падрыўнікоў з вопытных байцоў, якія ўжо мелі на сваім рахунку пушчаныя пад адхон нямецкія эшалоны з жывой сілай і тэхнікай, і з байцоў, што асвоілі падрыўную справу нядаўна (толькі ў брыгадзе №25 імя П. Панамарэнкі інструктар-падрыўнік **Маісей Урыцкі** навучыў згаданай справе з паўсотні маладых народных мсціўцаў).


Васіль БЯЛЯЕЎ і Маісей УРЫЦКІ (злева направа).

Так, скажам, у атрадзе імя М. Сільніцкага падрыўнікамі-віртуозамі былі Леанід Вавілін, Канстанцін Ваяводзін (камандзір узвода), Фёдар Дзеравягін (камандзір аддзялення), Сяргей Чугуноў (камандзір групы); у атрадзе імя М. Гастэлы – Віктар Агенскі, Ягорый Гаўрылаў, Барыс Глазкоў, Цімафей Грэбенчук, Віктар Клімкоў, **Віктар Львоў** (камандзір аддзялення), Марыя Мінц, Васіль Шутаў (камандзір узвода), у атрадзе імя Р. Катоўскага – **Іван Філютчык** з Талі (камандзір групы), у атрадзе імя Л. Даватара – Сцяпан Калянковіч з Ямінска, у атрадзе імя М. Кутузава – Андрэй Насановіч з Калінаўкі, у атрадзе імя Я. Гарбачова – Іван Ахрамейка, **Мікалай Ахрамейка** і Міхаіл Лагун з Малых Гарадзяцічаў, у атрадзе імя К. Каліноўскага – Рыгор Катовіч з Кузьмічоў, у атрадзе імя А. Неўскага – **Лёня Лялькін** з Падлуга. Усіх нельга і пералічыць!

Па-трэцяе, народныя мсціўцы стварылі запас узрыўчаткі. Гэтаму, зразумела, дапамагла і Вялікая зямля: толькі ў чэрвені 1943 г. адтуль было закінута на партызанскія базы 150 тон толавых шашак.

**І ўсё ж выбуховыя рэчывы заставаліся ў вострым дэфіцыце. Яго ліквідоўвалі самі народныя мсціўцы: выплаўлялі тол са снарадаў і мін.**

Аднымі з тых, хто займаўся такой небяспечнай справай, былі Максім Каўгарэня з Зялёнак і Сяргей Шыла з Касцяшоў – байцы атрада №2 імя М. Кутузава брыгады №100 імя С. Кірава. Толькі Сяргей Андрэевіч, як напісана ва ўзнагародным лісце да медаля «Партызану Айчыннай вайны», выплавіў пад тысячу кілаграмаў узрыўчаткі! А былі ж і ў іншых атрадах майстры!

Падрыхтоўка да «Рэйкавай вайны» не адмяняла правядзенне дыверсій на чыгунцы ў гэты перыяд. Яны здзяйсняліся ледзь не штодня. Так, 20 чэрвеня 1943 г. брыгада №64 імя В. Чкалава разграміла нямецка-паліцэйскі гарнізон станцыі Фалічы на лініі Слуцк–Асіповічы. Партызаны вывелі са строю ўваходны стрэлкі, пашкодзілі з паўкіламетра чыгуначнага палатна, узарвалі чыгуначны мост. А 28 чэрвеня вызначылася брыгада №25 імя П. Панамарэнкі: мінёры атрада імя А. Неўскага, у ліку якіх быў і Яўген Гуткоўскі з Жывуні, на Палескай чыгунцы падарвалі фашысцкі бронецягнік. У выніку былі знішчаны паравоз, тры бронепляцоўкі і больш за два дзясяткі варожых салдат. На жаль, 10 красавіка 1944 г. Яўген Аляксандравіч загінуў...

Што адбылося ў ноч на 3 жніўня 1943 года, вы ўжо ведаеце. «Рэйкавая вайна» працягвалася да 16 верасня. Народныя мсціўцы грамілі згаданыя камунікацыі. На чыгунку выходзілі цэлымі брыгадамі: адны байцы мініравалі стыкі рэек, другія – прыкрывалі мінёраў. І ўзрывалі, узрывалі, узрывалі!

**Ці быў плён?
О-о-о, яшчэ які!
Да пачатку восені перавозкі акупантаў чыгуначным транспартам скараціліся на сорак працэнтаў.
На некаторых участках рух нямецкіх эшалонаў быў затрыманы ад трох да пятнаццаці сутак.
А магістралі каля Магілёва не працавалі ўвесь жнівень.**

Дзеля аднаўлення разбуранай партызанамі чыгункі гітлераўцы вымушаны былі ў многіх месцах двухшляховыя ўчасткі ператтвараць у аднашляховыя, зварваць пашкоджаныя рэйкі, везці на замену рэйкі з Польшчы, Чэхіі, Германіі.

Зрэшты, народныя мсціўцы ўзрывалі не толькі чыгункі. Узнімалі на паветра масты, вадакачкі, знішчалі інфраструктуру станцый. І, канешне ж, працягвалі пускаць пад адхон эшалоны гітлераўцаў. І падыходзілі да гэтай справы творча, з выдумкай: там, дзе не маглі дастаць цягнік узрыўчаткай, выкарыстоўвалі супрацьтанкавую стрэльбу. Так, меліся сярод народных мсціўцаў асабліва меткія бранябойшчыкі. Дапусцім, Мікалай Шчарбачэня з Азломля ці Аляксандр Шпілеўскі з Азярнога, што ваявалі ў партызанскім атрадзе імя М. Гастэлы.

Каб неяк купіраваць дзеянні народных мсціўцаў, фашысты пачалі прыцягваць для аховы і абароны чыгуначных камунікацый дадатковыя сілы, нават часці з фронта. Але гэта не спыніла магутную хвалю партызанскіх дыверсій. Не паспелі гітлераўцы ачомацца ад «Рэйкавай вайны», як 19 верасня 1943 года стартавала аперацыя «Канцэрт», у час якой народныя мсціўцы зноў жа ледзь не на ўсёй акупаванай нямецкімі войскамі тэрыторыі СССР узгоднена і з новай сілай атакавалі варожую чыгунку.

Так набліжалася Вялікая Перамога...

**Сяргей КВІТКЕВІЧ,
навуковы супрацоўнік Любанскага музея народнай славы.**

**Фота з фондаў музея і з інтэрнэт-крыніц.**